# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
21
ЛІСТАПАДА
№ 28(1692)


ПРАЗ РАСЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

Гэта толькі ілюзія — што змест кожнага пражытага дня растае ў наступным. Жыццё само піша дзённік, нават тады, калі мы пазбягаем занатоўваць на паперы штодзённыя падзеі...
Такое адчуванне не пакідае, калі трапляеш у архіў. Зразумела, ён ёсць і ва універсітэце. Захоўвае мноства дакументаў, а па сутнасці — лёсаў.

## Сюды прыходзяць за мінулым

УЯВІЦЕ, як хочацца адчуць пах свайго экзаменацыйнага ліста, залікоўкі ці студэнцкага білета, калі мінулі гады пасля развітання з імі. Разам з гэтым пахам абавязкова нахлыне адчуванне самых яркіх дзён студэнцкага жыцця, таго часу, тых людзей. Гэта магчыма нават праз 75 гадоў — менавіта столькі захоўваюцца ў архіве асабістыя справы ўсіх выпускнікоў універсітэта.

Усяго — нічога, нейкія пажоўклыя паперы. Многія менавіта так ставяцца да таго, што захоўвае архіў. У яго сапраўды ёсць у тым ліку і «папяровае» прызначэнне. Людзі прыходзяць сюды за разнастайнымі пацвярджэннямі і абвяржэннямі. Сёння часцей за ўсё звяртаюцца за даведкамі, якія неабходны для пераразліку пенсій і для выезду за мяжу (як часова, на работу, так і на пастаяннае месца жыхарства). Нехта шукае адрасы былых аднакурснікаў, нехта згубіў сляды сваякоў, адной былой партызанцы пашчасціла нават знайсці даведку аб раненні, атрыманую ў лясах...

Толькі пасля смерці адной з выкладчыц універсітэта стала вядома, што яна была даволі вядомай падпольшчыцай у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэты ўражлівы і сумны факт нараджае ўпэўненасць, што часам мы давяраем архівам многае з таго, што не можам даверыць людзям. Потым звяртаемся туды за гэтымі звесткамі — дзякуючы нашай вечнай любові рабіць усё пасля, калі немагчыма нічога выправіць.

Жывуць у архіве і іншыя жыццёвыя гісторыі. Прыйшоў сюды аднойчы малады чалавек. Некалі быў выключаны з 5-га курса юрыдычнага факультэта БДУ, бо накіраваўся ў іншую, аддаленую, мясцовасць, дзе належыла яму, згодна з Крымінальным кодэксам, адбыць пэўны тэрмін. Калі вярнуўся, вырашыў новае жыццё пачынаць, на работу ўладкоўвацца. Спатрэбілася яму для гэтага дапамога супрацоўнікаў архіва. Патрабаваў даведку аб вучобе ва універсітэце, дзе спадзяваўся пазбегнуць паведамлення аб прычыне выключэння. У рашучай просьбе настойліваму маладому чалавеку адмовілі. Ён беспаспяхова імкнуўся перайначыць сваё асабістае мінулае...

Але такія выпадкі ўсё ж рэдка здараюцца. Штодзённая работа універсітэцкага архіва насычана справамі больш звычайнымі — даведкі, даведкі, даведкі... Тыя, каму яны патрэбны для перамены краіны жыхарства, плацяць за неабходны дакумент з архіва 25 рублёў у касу універсітэта. За тую ж паслугу ў БПІ бяруць 150 рублёў. Можа, і празмерная гэта сума, але яна добра высвечвае, які мізэрны кошт — 25 рублёў.

Загадчыца архіва магла б дазволіць сабе атрымаць... 12 такіх даведак (у політэхнічным інстытуце — дзве) на ўсю сваю месячную зарплату. Архіварыус — і таго менш. Так, супрацоўнікі нашага архіва належаць да шэрагу тых работнікаў вышэйшай школы, якія могуць «ганарыцца» адпаведнасцю сваіх даходаў толькі пражытачнаму мінімуму, нават не сярэдняй заработнай плаце ў рэспубліцы. Пакуль застаецца на паперы і такая дробязная магчымасць для паляпшэння іх матэрыяльнага становішча, як 30-працэнтная надбаўка. Яна гарантавана адпаведным распараджэннем Савета Міністраў СССР усім работнікам архіваў, якія заняты выдачай дакументаў, неабходных для пераразліку пенсій. Быццам бы гарантавана...

Пэўна, праз некаторы час будучыя супрацоўнікі універсітэта знойдуць у архіве некалькі загадаў і будуць бязмерна здзіўляцца, як многа нерэалізаваных гарантый было ў наш час...

ЗВАНОК З РЭДАКЦЫІ

## Камсамол хутчэй жывы, чым...?

*— Ці існуе ў БДУ хаця б адна камсамольская арганізацыя сёння? — спыталіся мы ў тэлефоннай размове ў намесніка сакратара камітэта камсамола універсітэта Аляксея БАГДАНОВІЧА.*

*— Зразумела! — рашуча адказаў ён.— Больш таго, рана прысвячаць паніхіду камітэту камсамола ўсяго універсітэта — яго дзейнасць толькі прыпынена, як памятаеце.*

*Найбольш актыўныя факультэцкія камітэты — на ФЭФе, хімфаку і ў філолагаў. Але сёння і яны, разам з іншымі, займаюць, па сутнасцю, пазіцыю чакання. Чакаюць XXX з'езда камсамола Беларусі, які адбудзецца 5—8 снежня. Ён і павінен канчаткова вырашыць усё...*

*Пэўна, асабістая сціпласць перашкодзіла Аляксею паведаміць рэдакцыі «БУ» тое, аб чым мы даведаліся з іншых крыніц: дэлегатам на з'ездзе ад камсамольскай арганізацыі БДУ будзе менавіта ён — Аляксей БАГДАНОВІЧ.*

ЗАМЕЖНІКІ Ў НАС

## НАСУПЕРАК ЗМРОЧНЫМ ПРАГНОЗАМ



З кожным днём паток студэнтаў, якія прыбываюць у нашу рэспубліку з заходніх краін, змяншаецца ў некалькі разоў. Мабыць, прычына ўсяму — катастрафічнае становішча ў нашай эканоміцы і рост злачыннасці ў адносінах да замежных гасцей.

Тым не менш, групу студэнтаў з горада Ност-Ізенбург не напужалі цяжкасці і крымінагеннае становішча. Іх галоўная мэта — праверка сумесна з універсітэцкімі эколагамі ўзроўню радыяцыі ў розных абласцях Рэспублікі Беларусь, а таксама забруджанасці рэк і вадаёмаў.

Акрамя таго, ведаючы аб цяжкасцях з медыцынскімі прэпаратамі ў нашай рэспубліцы, яны бязвыплатна перадалі медыкаменты прадстаўнікам Беларускай Праваслаўнай царквы.

— У наступным годзе,— гаворыць адна з удзельніц акцыі Фрауке БЕРАНД,— мы плануем перадаць вялікую партыю медыцынскага абсталявання ў якую-небудзь з лячэбных устаноў горада Мінска.

Алег ГУСАК.
Фота аўтара.

РЭКЛАМА

## Добрай раніцы!

Калі вымавіць гэтае прывітанне з пэўнай — зларадна-здзеклівай — інтанацыяй, атрымаецца сінонім шматзначнай рэплікі «Прыехалі!».

Малое прадпрыемства «МІСС», якое працуе пры БДУ, аб'яўляе прыём на падрыхтоўчыя курсы па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы, рускай і беларускай мовах.

Асноўныя гарантыі прадпрыемства — у тым, што заняткі будуць весці выкладчыкі універсітэта, якія прымалі ўступныя экзамены раней. Ёсць магчымасць рыхтавацца сам-насам з імі. Але ёсць шанц і для тых абітурыентаў, якія захоўваюць вернасць школьным «групавым традыцыям», яны могуць запісацца ў групы па 10 ці па 20 чалавек — на выбар.

Астатнія дэталі можна ўдакладніць па тэлефоне 26-59-56 ці ў пакоі 417 галоўнага корпуса універсітэта з 10 да 12 гадзін у любы працоўны дзень нядзелі.

Здзеклівае «Добрай раніцы!» — не для вас. Ці не так?

НАЎЗДАГОН

## Ёсць і такі прафсаюз

На мінулым тыдні, 13 лістапада, адбыўся справаздачна-выбарны сход прафсаюзнай арганізацыі ўпраўлення БДУ. Арганізацыі асаблівай, члены якой — кіраўніцтва універсітэта, аддзелы кадраў і вучэбны, бухгалтэрыя, канцылярыя і іншыя прадстаўнікі адміністрацыі.

Сход, які яны правялі, таксама звычайным не назавеш. Звычайнай была яго форма: справаздача старшыні прафбюро, справаздача рэвізійнай камісіі, выступленні ў спрэчках, выбары... Але нетрадыцыйным быў змест, дзякуючы нестандартнаму дакладу старшыні Л. В. Бабінок, таму, што яе выбралі на гэтую пасаду на другі тэрмін запар АДНАДУШНА, а таксама цёплай атмасферы схода. Не так часта мы сустракаемся з ёй у апошні час...

На сходзе выступіў старшыня прафкома супрацоўнікаў БДУ А. В. Паўлаў. Ён расказаў аб бліжэйшых перспектывах работы універсітэцкага стала заказаў і спыніўся на больш глабальным пытанні — будучым прафсаюзнага руху ў нашай рэспубліцы.

ДОШКА АБ'ЯЎ

Цэнтр маладзёжных ініцыятыў запрашае вас сёння а 15 гадзіне паслухаць ва аўдыторыі 206 галоўнага корпуса лекцыю са шматабяцаючай тэмай: «Адзінства і супрацьлеглацсь вéдаў Усходу і Захаду. Аб нараджэнні-развіцці прыроды, чалавека, грамадства». Вашым лектарам і субяседнікам будзе Валерый Аркадзьевіч ДОЛГУШАЎ, кандыдат фізіка-матэматычных навук.

## Рукі залатыя патрэбны ўсім

Адкінце зараз усялякую містыку — не ўсе з такімі рукамі нараджаюцца. Вы паспрабуйце зрабіць іх сабе самі! Прымусовым стымулам можа стаць для вас грашовая сума ў 320 рублёў. Развітаўшыся з ёй, вы, пэўна, не дазволіце сабе прапускаць заняткі тры разы на тыдзень на працягу двух месяцаў. І — атрымаеце пасведчанне на рускай і англійскай мовах, на той выпадак, калі захочаце выкарыстаць свае залатыя рукі за мяжой.

Такім чынам, прыходзьце 28 лістапада а палове сёмага вечара ў аўдыторыю № 38 спорткомплекса універсітэта (вул. Кастрычніцкая, 8а). Тут адбудзецца арганізацыйны сход для жадаючых трапіць на курсы масажыстаў, у праграме якіх — лячэбны, апаратны, кропкавы і бесконтактавы віды масажу. Заняткі будуць весці кваліфікаваныя спецыялісты. Спецыяльнай адукацыі, як і іншых спецакалічнасцей, ад навучэнцаў не патрабуецца. Адно толькі вялікае жаданне! Пасля паспяховага заканчэння курсаў вы будзеце мець не толькі дакументальнае пацвярджэнне ў выглядзе пасведчання, але і рэальнае права працаваць у лячэбных установах. А самую галоўную магчымасць — дапамагаць сваім блізкім.

Па адным з гэтых тэлефонаў — 27-30-00, 20-69-65 — вы можаце пачуць не толькі адказы на вашы пытанні, але і тыя самыя словы: «Залатыя рукі патрэбны ўсюды!».

ФОТАПОЗІРК

# Начное рандэву



У ноч з 16 на 17 лістапада ў Рэспубліканскім палацы прафсаюзаў адбылася першая гарадская студэнцкая тусоўка, у якой прыняло ўдзел некалькі тысяч студэнтаў і навучэнцаў розных навучальных устаноў Мінска.

Не абыйшлося, зразумела, без прыгод. Таму хапіла работы і хлопцам з АМОНа. Тым часам жадаючыя глядзелі відэафільм «Луна-44» — адзіны на ўсю ноч. Адзіны буфет бралі штурмам. А што рабіць, калі перакусіць больш няма дзе?

Гавораць, выбіўшы шкло, ў памяшканне забраліся «чужынцы», якім не хапіла білетаў, затое дасталося залішне моцных напіткаў.

Адзінае, што прыйшлося па душы ўсім — дыскатэка. Яе, як вы здагадаліся, рыхтавалі прадстаўнікі універсітэта — Юрый Чабатароў і Аляксандр Вераценнікаў.

Ноч кароткая. Як нашы ўспаміны аб ёй?

А. ГУСАК,
Фота аўтара.





ШТО ЧАКАЕ?

# Не цесляры, не качагары мы...

НАМ ПРАРОЧАЦЬ халодную і галодную зіму. На што спадзявацца студэнту?

Кожную раніцу пачаць на ўсялякі выпадак абліваццa халоднай вадой (пакуль яна яшчэ ёсць) ці сушыць сухары на батарэях паравога ацяплення (але, на жаль, не ва ўсіх інтэрнатах батарэі грэюць)?

Мажліва, неяк высветліць становішча нам дапаможа прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы Уладзімір Іванавіч ТАРАСЕВІЧ, размову з якім мы прапануем вашай увазе.

— Уладзімір Іванавіч, ці добра мы падрыхтаваліся да зімы?

— Уся краіна яшчэ не падрыхтавана да зімы. Вы ж ведаеце пра трагічныя выпадкі гібелі ад холаду людзей ў Хабараўску... Тыя праблемы, якія ёсць усюды, безумоўна, уплываюць на становішча і ў нашым універсітэце. Так, напрыклад, у горадзе патрабуюць замены каля 200 кіламетраў цеплатрасы.

— У другім інтэрнаце не так даўно некалькі дзён зусім не працавала ацяпленне... Ці ёсць гарантыя, што з надыходам сапраўдных халадоў студэнт не трапіць у жахлівае становішча?

— Якраз у другім інтэрнаце не так усё і дрэнна. Усе неабходныя рамонтныя работы там праведзены. А вось што датычыць, напрыклад, пятага інтэрната, ды і трэцяга, і сёмага, то тут яшчэ хапае шмат сур'ёзных неадкладных спраў.

— А як наконт вучэбных карпусоў?

— З вучэбнымі карпусамі прасцей. Амаль усе ўжо ўцяплілі.

Справа ў тым, што студэнт часцей бывае ў інтэрнаце, чым на занятках, таму, напэўна, хапае часу, каб разбіць у інтэрнаце замкнёныя дзверы, вокны, штонебудзь паламаць.

Я наогул лічу, што дзеля таго, каб становішча паправіць, трэба больш прынцыпова падыходзіць да пытанняў парушэння правіл пражывання ў інтэрнаце.

— І ўсё ж, ці прыйдзецца гэтай зімою студэнту «качагарыць»?

— Будзем спадзявацца на лепшае... Я думаю: усё ж не прыйдзецца.

Т. КАЗАК.

ВАЧАМІ ВАНДРОЎНІКА

# ДОБРАЯ КАЗКА ЭСТОНІІ

Застасцца успамінаць Эстонію як добрую казку. Рэспубліка яшчэ не стала «заграніцай», але жыццё яе ніколькі не падобнае на наша. Гэта адчуваеш, калі мінаеш рэдкія маленькія вёсачкі. Бязлюддзе. Яно ўражвае перш за ўсё. Адзін наш Мінск увабраў народу больш, чым уся Эстонія, разам узятая. Таму такія рэдкія пешаходы. Затое на чыстых восеньскіх палях дзесьці сярод лясоў пасвяцца карлікавыя эстонскія каровы і мільгацяць за шклом турысцкага аўтобуса абсыпаныя легендамі гістарычныя помнікі. Не, гэта не цэментныя камлыгі манументаў, а мудрагеліста завілісты ядловец, каменні, месцы, дзе стаялі знакамітыя сваімі гаспадарамі сядзібы і яшчэ нешта кранаючае з пункту гледжання эстонца. Не пакідае адчуванне, што людзі тут жывуць у згодзе з прыродай. Жылыя дамы ў Эстоніі незаўважныя для вачэй. Яны не сабраны на пятачках, упіраючыся ў бакі адзін аднаму. Яны паважна стаяць на буйных зямельных участках, выглядваючы з зеляніны вокнамі мансард.

Прыйшоў час спяваць оды эстонскай архітэктуры. Тут пануе Яе Вялікасць традыцыя, і дух добрай даўніны паспяхова захоўваецца шмат стагоддзяў запар. Зразумела, не без страт. Некаторыя пабудовы не назавеш дагледжанымі: падае тынкоўка ці аблупліваецца фарба там, дзе не дакраналася рука рэстаўратара. Але нават гэта не можа перашкодзіць вандроўніку далей зачароўвацца даўнінoй.

Афіцыйныя пабудовы курортнага гарадка Пярну, такія, як ратуша ці сабор, помняць візіты каранаваных асоб Расіі, а ў Таліне само сярэднявечча заблукала ў вузкіх брукаваных каменнем вулачках, ды так і засталося на стагоддзі. Яно ходзіць, бразгаючы шклом вялікіх ліхтароў, паскрыпваючы шыльдамі, падлічваючы прыступкі, якія паабцёрліся.

Вастраверхія чарапічныя дахі, вялізныя вокны, карнізы, упрыгожванні над вокнамі і дзвярыма, выкладзеныя кантрастнымі па колеру цаглінкакмі — усё гэта атрыбуты архітэктуры Эстоніі, якія робяць яе падобнай на дзіцячую цацку. Так будавалі стагоддзі назад, і амаль таксама цяпер. Дом эстонца з высокай мансардай, з абавязковым балкончыкам ці сцяной-ліхтаром выглядае не менш маляўніча, чым жыллё каго-небудзь са знаці ў Старым Таліне. Дадайце багацце зеляніны, акуратныя дарожкі, жывую агароджу і некалькі сабак. Вядома, гэта апісанне грашыць умоўнасцю, але ж дзіўна тое, як пры ўсёй непарушнасці архітэктурнай традыцыі, якая дыктуе дамам-катэджам адзіны стыль, эстонцы здолелі стварыць столькі варыяцый. Углядаючыся ў будынкі з рызыкай стаміць вочы, усё роўна не знойдзеш двух аднолькавых. Дзякуючы няўлоўнай гульні святла, форм і дэталяў, кожны раз узнікае нешта новае. Для мяне была дзіўнай такая цэласнасць культуры Эстоніі. Той культуры, якая прыводзіць у суадносць унутранае і знешняе — нацыянальны дух эстонцаў і акультуранае імі асяроддзе пражывання. Непаўторнасць Эстоніі адчуваецца не толькі ў Старым Таліне, але і ў невялічкай вёсачцы, і сярод палёў з роўным пругам леса на даляглядзе, і ў празрыстым, дагледжаным англійскім парку, дзе раніцай старанна зграбаюць залатыя россыпы лісця. Узгадаваная нацыянальная культура адбіваецца і на рэстаўрацыі вежы, дзе захапляе ювелірная дакладнасць цаглiннага мура, і ў воблаку дробных ліловых астраў, якія паўтараюць форму круглай вазачкі ў кафэ. Цяга да дэкаратыўнасці, да знешняй прапарцыянальнасці форм і прыгажосці ў эстонцаў праяўляецца нават у такіх дробязях. Несумненна, гэта вынік унутранай культуры народа, якая культуывалася не год і не два. Пэўна, менавіта з агульнай культурнай традыцыі пачынаецца адзінства народнага духу. Збіраючыся стаць суверэнным народам, мы хутка адчуем, як патрэбна нам гэта сувязная ніць.

Наталля ЖУК.

ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ ЧАРНОБЫЛЯ

# Возьмем у саюзнікі прыроду!

**Прапануем вам меркаванні начальніка аддзела радыялогіі і рэкультывацыі НВА «Прыпяць» Мікалая Паўлавіча АРХІПАВА (ён з 1957 года займаецца праблемай атамнай бяспекі), якія выказаны ў гутарцы з карэспандэнтам газеты «Зеленый мир».**

— Цяпер, амаль праз пяць гадоў пасля чарнобыльскай катастрофы, яе вынікі неабходна ўбачыць нарэшце ў рэальным маштабе, каб прызнаць: нельга ставіць задачу ліквідацыі гэтых вынікаў. У нашых сілах толькі зменшыць іх, узяўшы ў саюзнікі прыроду.

Мы былі зусім не гатовыя да паражэння. Адбіліся доўгія гады ўсеагульнага засакрэчвання і вузкай спецыялізацыі, калі адзін спецыяліст не ведае, што робіць у яго пад бокам другі.

Усе нашы дзеянні малапаспяховыя. Таму эколагі ўжо з 1986 года пачалі актыўна выступаць супраць маштабных тэхнічных дзеянняў у заражанай зоне. Шляхам вывядзення, знішчэння нельга дзейнічаць — патрэбна толькі лакалізацыя ачага.

Павінен заявіць і аб некампетэнтнасці, амбіцыёзнасці розных урадавых камісій. Яны спачатку прымаюць рашэнні, а потым прымушаюць вучоных «навукова» абгрунтоўваць гэтыя рашэнні!

Напрыклад, у 1986 годзе хацелі пахаваць «рыжы лес» (заражаны лес у зоне) — мы пярэчылі. Пісалі ва ўсе інстанцыі і быццам бы дабіліся свайго — лес вырашылі захаваць. Ён жа лепш за ўсё стабілізуе радыяцыйнае становішча. Там ужо і зялёны падлесак пайшоў — прырода сябе аднаўляе... Аднак хутка мясцовыя ўлады цішком ўсё ж такі закапалі ў траншэі з высокім узроўнем грунтавых вод прыкладна 1000 гектараў «леса». Рэшткі ядзернага паліва, зразумела, апынуліся ў глебавых водах. Як мы і папярэджвалі, распаўсюджанне радыенуклідаў аказалася ў 50—70 разоў больш за тое, калі б лес застаўся стаяць. А зараз абмяркоўваецца праект выкапвання закапанага леса. Аўтары — тыя ж...

Наогул мы пастаянна сутыкаемся з гэтай арыентацыяй на хуткую перамогу, імкненнем «схаваць канцы ў ваду» (у даным выпадку гэта можна разумець літаральна). Памятаеце, ужо ў ліпені 86-га нам абяцалі рээвакуацыю жыхароў зоны! Уся справаздачнасць ідзе па колькасці кубоў знятага грунту, залітага бетону і г. д.

Мая пазіцыя: мінімум умяшання. У нас для гэтага проста няма сродкаў. А тое, што робіцца, вельмі нагадвае авантуры. Вось, напрыклад, нядаўна «мылі лес» — палівалі яго пральным парашком з верталётаў. На кароткі час фон збілі, але ён адразу аднавіўся... Далей, мы дэзактывавалі адзін раён у Прыпяці — магутнасць участку за гэты ж час упала на 20 працэнтаў. Праз тры гады праверка паказала, што розніца ў інтэнсіўнасці фону на двух участках рэзка скарацілася — яны адрозніваліся толькі ў два разы. Значыць, хутка розніца наогул знікне...

Прырода — лепшы дэзактыватар. Чалавечыя дзеянні на яе фоне выглядаюць па меншай меры залішняй мітуснёй. Сэнс мае толькі лакалізацыя зоны. На Захадзе, напрыклад, гэта разумеюць, і поспехаў ад дэзактывацыі не чакаюць, хоць і захапляюцца шчыра «рускім размахам».

САКРЭТ ФІРМЫ

# КОЖНАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ — СВАЕ ВНУ

*З гэтага года пачаў дзейнічаць Тэхналагічны універсітэт Рускай суполкі Латвіі.*

*У першую чаргу ТУ будзе рыхтаваць спецыялістаў для невялікіх (прыватных, акцыянерных, сумесных і г. д.) навукова-камерцыйных, вытворчых і іншых прадпрыемстваў, якія працуюць у галіне «хай тэхноладжы» і арыентуюцца на экспарт.*

*Праца пасля навучання не гарантуецца, але універсітэт будзе выступаць пасрэднікам у пошуках вакансій.*

*Сістэма навучання — двухэтапная. Першы этап (3—3,5 гады) — агульнанавуковая і агульнатэхнічная падрыхтоўка студэнтаў, які завершыцца атрыманнем ступені бакалаўра навук. Другі этап (2—3 гады) — спецыялізацыя, якая будзе ажыццяўляцца ў вядучых ВНУ Расіі і заходніх краін. Адбор студэнтаў для навучання на другім этапе будзе ажыццяўляцца па іх жаданню, але з улікам вынікаў працы і меркавання выкладчыкаў.*

*Асноўны метад работы — індывідуальнае навучанне. Таму ўжо з першага курса ў кожнай групе ўсяго 10—12 чалавек.*

## ДЗЕСЯЦЬ, ДВА, АДЗІН, НУЛЬ...

*У наступным годзе ў Латвійскім універсітэцэ — усяго два ўступныя экзамены: па профілю (тэст) і, па ўсіх бакалаўрыйскіх праграмах, замежная мова.*

*Але тым, хто здае экзамены на рускай мове, прапануюць яшчэ і экзамен па латышскай.*

*Тэст ацэньваецца па дзесяцібальнай сістэме, замежная мова — па дзесяці- і трохбальнай сістэмах. Па апошняй ацэньваецца веданне латышскай мовы (на ўзроўні школьнай праграмы): «О», «1», ці «2». Калі за латышскую мову атрыманы «0», бывай, ЛУ!*

*Раней у Латвійскім універсітэце былі і рускія, і латышскія групы, зараз універсітэт паступова пераходзіць на навучанне ў адзін паток — з агульным конкурсам і агульнай вучобай.*

*Для тых, хто не мае шчасця, але валодае грашыма, прадугледжана платнае навучанне. У гэтым годзе за год навучання на дзённым аддзяленні неабходна ўносіць 4 тысячы, завочным — 2 тысячы рублёў.*

*Восенню на першы курс узялі 150 «платных» студэнтаў, з іх 51 скончыў рускую школу. Увогуле з усіх першакурснікаў — каля 25 працэнтаў — выпускнікі рускіх школ.*

НАШЫ ЗА МЯЖОЙ

# «Навошта наймаць савецкіх вучоных?»

Артыкаул пад такой назвай надрукавала нядаўна амерыканская навуковая газеты «Сайенціст». Яе аўтар Стэфан Розен, астрафізік па спецыяльнасці, з'яўляецца старшынёй кансультацыйнага камітэта па навуцы і тэхніцы і дырэктарам праграмы «Пераходны этап у навуковай кар'еры» арганізацыі «Уоркмэн сёкл», якая знаходзіцца ў Нью-Йорку.

Што гэта за арганізацыя, што за праграма — вы даведаецеся з тэкста артыкула, які мы прыводзім цалкам. Адзначым толькі, што артыкул гэты надрукаваны ў «Сайенціст» пад рубрыкай «Каментарый».

Хуткі крах бяссла ўнага жнівеньскага перавароту ўзмацніў жаданне некаторых заходніх бізнесмэнаў рабіць інвестыцыі ў Савецкі Саюз. Аднак існуе і магчымасць укладваць сродкі ў савецкія тэхналогіі, не пакідаючы Злучаных Штатаў. Для гэтага дастаткова прыняць на работу вучоных-эмігрантаў з Савецкага Саюза. Толькі за апошнія два гады 4 тысячы такіх прыбылі ў Злучаныя Штаты.

Савецкія вучоныя-эмігранты маюць агульныя карані з вялікай рускай традыцыяй навуковага наватарства. Перыядычная табліца Мендзялеева, спадарожнік і хірургічная прылада для зшывання — вось толькі некаторыя з гэтых дасягненняў.

Новыя эмігранты прыехалі ў ЗША, каб пазбавіцца рэлігійных ганенняў (99 працэнтаў з іх — яўрэі) і камуністычнага анямення, каб пачаць новае жыццё. Яны таксама даюць магчымасць больш пільна ўглядзецца ў цяперашняе становішча савецкай навукі, а таксама вызначыць патэнцыяльныя магчымасці для распаўсюджвання амерыканскай прадукцыі ў краіне, адкуль гэтыя вучоныя родам.

Здаецца, што пасля 1993 года свабодная эміграцыя з былога Савецкага Саюза прынясе ў ЗША яшчэ больш таленавітых людзей, якія жадаюць пачаць новае жыццё. Ці змогуць амерыканскія кампаніі і універсітэты выкарыстоўваць гэтыя таленты?

Мае ўражанні грунтуюцца на кантактах з сотнямі высокапрафесійных савецкіх вучоных-эмігрантаў, якія маюць навуковыя публікацыі, доктарскія ступені, часам у дзвюх галінах. Два гады назад я пачаў аказваць ім дапамогу ў пошуках працы ў навуковым згуртаванні ЗША. Для гэтага мне давялося распрацаваць праграму «Пераходны этап у навуковай кар'еры», якая сёння здзяйсняецца пры «Уоркмэн сёкл».

Мой вывад: цяпер самы што ні ёсць зручны час для таго, каб наймаць на працу савецкіх вучоных. Таму што яны — за рэдкім выключэннем — імкнуцца да самастойнасці і спачатку вельмі непатрабавальныя ў плане зарплаты.

Майце на ўвазе наступнае: савецкія вучоныя-эмігранты вельмі працаздольныя. Сямён Цыпурскі, вучоны-матэрыялазнаўца, які ў мінулым годзе прыехаў з Масквы, цяпер працуе ва універсітэце штата Арызона, па 12 гадзін у дзень, 7 дзён у тыдзень праводзячы доследы ў галіне біямінералізацыі.

Спектр іх талентаў шырокі: сярод іх можна сустрэць прадстаўнікоў многіх навуковых спецыяльнасцей. Мне, напрыклад, шанцавала на доктараў навук у галіне рыбазнаўства, лазерных гіраскопаў, інерцыяльнай навігацыі, гідрадынамікі, аптымізацыі маршрута.

Яны дэманструюць вялікую навуковую гібкасць. Аркадзь Рубін прымяніў свае веды ў мадэліраванні рэгрэсій і прагназіраванні часовых радоў у спецыяльных праектах па даследаванню рынка для кампаніі «Джонсан энд Джонсан».



Яны прапаноўваюць свежы погляд на праблему і садзейнічаюць свайго роду «перакрыжаванаму апыленню» навуковых даследаванняў у ЗША. Рафаіл Кушак, спецыяліст у галіне біяхіміі і фізіялогіі мембраннага засваення, у Гарвардскім універсітэце ўзяўся за разгадку таямніц дзейнасці эмбрыянальных экзімаў.

Яны валодаюць вузкапрофільнымі спецыяльнасцямі, якія абяцаюць вялікую аддачу. У мінулым годзе ЗША закупілі савецкую тэхналогію тэрмаэлектронных пераўтваральнікаў для выкарыстання ў кампактных ядзерных рэактарах на арбітальных касмічных сілавых устаноўках. Юрый Кравінскі, чыя доктарская дысертацыя была прысвечана распрацоўцы такіх сілавых установак, нядаўна прыбыў у ЗША і ўносіць грунтоўны ўклад у развіццё гэтай праграмы.

Яны адкрылі з'явы, пра якія амерыканскія вучоныя нават не падазравалі. Віталь Палуноўскі, які працуе цяпер ва універсітэце штата Мічыган (спецыяльнасць — біялогія клеткі і генетыка), высветліў, што пры траўмах лёгкіх некроз клетак адбываецца адначасова з разрастаннем клетак — адкрыццё, якое можа садзейнічаць памяншэнню летальных вынікаў.

Яны ў вышэйшай ступені непатрабавальныя. Я знаёмы з савецкімі вучонымі-эмігрантамі, якія маюць двайную доктарскую ступень, якія прынялі (і з іншымі, якія б ахвотна прынялі) пасады для пачынаючых, каб даказаць свой узровень, палепшыць веданне англійскай мовы, авалодаць амерыканскім вопытам і публікавацца ў амерыканскіх часопісах.

Яны жадаюць замацавацца на новым месцы. Яны ідуць насустрач магчымасцям, якія адкрываюцца, накіроўваючы свае энергію, талент і храбрасць на тое, каб пачаць новае жыццё.

У эру недахопу навукова-тэхнічных кадраў у ЗША прыезд савецкіх эмігрантаў — даследчыкаў, выкладчыкаў і спецыялістаў у галіне тэхнікі — з'яўляецца сапраўдным «падарункам лёсу». Уцечка мазгоў з СССР з'яўляецца прытокам мазгоў у ЗША.

# Спосаб выратаваць савецкія навуковыя кадры вынайдзены ў Амерыцы

*— Гэта не эміграцыя, а сапраўдная эвакуацыя,— зазначыў у размове з амерыканскім карэспандэнтам адзін з адказных супрацоўнікаў Маскоўскага інстытута ЗША і Канады Андрэй Картуноў.*

*Гаворка ішла пра тое, што Савецкі Саюз апошнім часам страчвае мноства таленавітых, кваліфікаваных і прадпрымальных грамадзян, а калі ў 1993 годзе ўступіць у сілу Закон аб свабодным выездзе, эміграцыйная тэндэнцыя ўзмацніцца.*

*Сотні талентаў, якія застаюцца пакуль савецкімі грамадзянамі, знаходзяцца ў Злучаных Штатах па доўга- і кароткатэрміновых працоўных кантрактах. І займаюць штатныя пасады ва універсітэтах ад Каліфорніі да Масачусетса. У той час, калі некаторыя пасля заканчэння кантрактаў адбываюць на радзіму, многія шукаюць новыя пасады, каб неяк затрымацца ў Злучаных Штатах.*

*У амерыканскіх універсітэтах і каледжах працуе вялікая колькасць савецкіх матэматыкаў і фізікаў. У інстытуце тэарэтычнай фізікі Мінесоцкага універсітэта амаль увесь штат складаецца з былых савецкіх вучоных.*

*Савецкі біёлаг Алег Свірыдаў дапамог распрацаваць спецыялістам нацыянальнага інстытута здароўя новы спосаб вымярэння канцэнтрацыі гармонаў у крыві. У Стэнфардскім універсітэце савецкі біёлаг дапамог раскрыць таямніцу заражэння СНІДам некалькіх пацыентаў аднаго стаматолага ў Фларыдзе, а тэлефонная кампанія «Расіфік бэл» плануе ў будучым, 1992 годзе запрасіць на работу па кантрактах чатырох савецкіх праграмістаў для распрацоўкі новых сістэм.*

*Некаторыя савецкія эмігранты адкрываюць свае тэхнічныя кампаніі. Сярод іх шмат праграмістаў. І ў Злучаных Штатах яны, зразумела, працягваюць займацца сваёй справай. Адзін з іх — Аляксей Пажатнаў — стваральнік папулярнай ва ўсім свеце гульні «Тэтрыс». Мільёны экзэмпляраў гэтай гульні былі перакуплены многімі краінамі, але ўвесь ганарар за гэта дасягненне дастаўся акадэмічнаму інстытуту, дзе раней працаваў аўтар. Цяпер Пажатнаў працуе па кантракту ў амерыканскай кампаніі пад Сіэтлам. Зразумела, было б перабольшваннем сцвярджаць, што амаль усе савецкія эмігранты, нават з вучонымі ступенямі, адразу ж атрымліваюць у Амерыцы камандныя пасады. Так атрымліваецца толькі ў буйных фізікаў-тэарэтыкаў, матэматыкаў, біёлагаў, хімікаў. Больш складана даводзіцца медыкам, выкладчыкам і эканамістам. Што датычыць даследчыкаў сярэдняга рангу і інжынераў, па словах былога савецкага фізіка, які працуе ва універсітэце Джона Гопкінса ў Балцiморы,— Аляксандра Каплана, яны становяцца праграмістамі, бухгалтарамі ці вадзіцелямі таксі. І лічацца назаўсёды страчанымі для навукі і прамысловасці.*

*Адна з прычын такіх цяжкасцей звязана з тым, што амерыканскія універсітэты даўно багатыя на таленты. Часткова дзякуючы таму, што ў апошнія гады ў Злучаныя Штаты перасялілася шмат эмігрантаў з Кітая, Індыі і Вялікабрытаніі. Таму савецкія эмігранты сутыкаюцца з вострай канкурэнцыяй. Але ніякія перашкоды не спыняць прытоку савецкіх вучоных у ЗША, тым больш цяпер, калі з-за вострых эканамічных цяжкасцей асігнаванні на навуку ў Савецкім Саюзе былі рэзка зменшаны. «Для вучоных няма ні грошай, ні працоўных месцаў, і яны больш не карыстаюцца ранейшай павагай з боку грамадства»,— гаворыць акадэмік Сагдзееў. Недахоп цвёрдай валюты прывёў да спынення імпарту навуковай апаратуры, многія савецкія вучоныя перасталі атрымліваць замежныя навуковыя часопісы.*

*— Я траціў увесь час на тое, каб здабываць адзенне, ежу, усё самае неабходнае,— гаворыць былы начальнік аддзела матэматычнага забеспячэння Маскоўскага інстытута касмічных даследаванняў Данііл Усікаў, які працуе цяпер у Марленскім універсітэце.— Тут мая працаздольнасць у дзесяць разоў вышэйшая.*



*Фізік з Каліфарнійскага тэхналагічнага інстытута Сцівен Кунін гаворыць, што ўсе амерыканскія універсітэты цяпер проста патанулі ў лістах ад савецкіх вучоных, якія імкнуцца трапіць на работу ў Злучаныя Штаты. І хаця прыём бежанцаў з Савецкага Саюза цяпер абмежаваны (50 тысяч у год), месцы для буйнейшых вучоных будуць знаходзіцца заўсёды. Іх станоўчае ўздзеянне на амерыканскую навуку ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі зможа аказацца больш карысным, чым можна было чакаць, мяркуючы па іх колькасці.*

*Дырэктар інстытута тэарэтычнай фізікі Мінесоцкага універсітэта Лары Маклеран пачаў вербаваць савецкіх вучоных два гады назад. Сёння пяць з шасці вядучых прафесараў — былыя савецкія вучоныя. Сярод фізікаў-аспірантаў апошнія дзесяць гадоў пераважалі кітайскія. Цяпер іх месца занялі выхадцы з Савецкага Саюза.*

*У лабараторыі ядзернай фізікі Масачусецкага тэхналагічнага інстытута працуюць многія даследчыкі з Серпухоўскай лабараторыі. Яны дапамагаюць распрацаваць апаратуру для гіганцкага амерыканскага паскаральніка элементарных часціц. З тысячы часовых пасад для замежнікаў, існуючых тут, семдзесят тры займаюць савецкія вучоныя, а яшчэ дзевяць з іх прыняты на пастаянную работу.*

*У Прынстанскім універсітэце працуе Аляксандр Палякоў — першакласны спецыяліст, па выказванню загадчыка фізічным сектарам Сцюарта Сміта, якім ганарыўся б любы універсітэт. У Ельскім універсітэце аналагічным аб'ектам гонару з'яўляецца былы савецкі матэматык Грыгорый Маргуліс. У Вашынгтонскім універсітэце гэта нядаўна прыняты на работу пасля доўгіх пошукаў падыходзячага кандыдата новы савецкі эмігрант Барыс Співак, спецыяліст па фізіцы цвёрдага цела.*

*— Рэальныя эканамічныя магчымасці,— гаворыць прэзідэнт Каліфарнійскай камп'ютэрнай фірмы Крыс Донэр,— цяпер не ў тым, каб прадаваць рускім тавары, а ў тым, каб выкарыстаць іх таленты.*

*Некаторыя савецкія эмігранты арганізавалі ўжо ўласныя кампаніі пераважна для распрацоўкі камп'ютэрных праграм. Яны ахвотна прымаюць на работу былых суайчыннікаў. Так, у адной з Бостанскіх кампаній, заснаванай матэматыкам Уладзімірам Гейзбергам, 7 з 11 супрацоўнікаў — былыя савецкія грамадзяне.*

*Для Злучаных Штатаў прыток савецкіх вучоных карысны. А для Савецкага Саюза? Ці не будзе гібельным такі адток кадраў для савецкай навукі? Па меркаванню акадэміка Сагдзеева, якраз наадварот. «Магчыма,— лічыць ён,— гэта адзіны спосаб выратаваць савецкія навуковыя кадры. Некаторыя, папрацаваўшы ў ЗША, вернуцца назад, узбагаціўшыся вопытам і новымі ведамі».*

*Так ці інакш, але вучоныя працягваюць прыбываць у ЗША. З 50 тысяч савецкіх бежанцаў, якія апошнімі месяцамі прыехалі ў Злучаныя Штаты, 800 чалавек маюць навуковыя ступені, а больш за 8 тысяч былі інжынерамі.*

(«БІЗНЕС УІК»).

# МАЙСТРОЎНЯ

Ягор КОНЕЎ

## ТВАР НА СЦЯНЕ

**У літаратуры не навічок. Чытачы часопіса «Маладосць» яшчэ ў мінулым годзе пазнаёміліся з яго апавяданнямі.**

**Незвычайны погляд на звычайныя з'явы, складаныя абставіны і іх асэнсаванне — вось што вылучае творы маладога празаіка, які вучыцца на III курсе факультэта журналістыкі.**

...«Уночы, калі чалавек бачыць барвовы месяц, з ім атрымліваецца няшчасце»,— так казалі мне калісьці.

Калі я прачнуўся той ноччу, то ўбачыў у акне вогнены дыск месяца, зацягнуты празрыстай дымкай. Цішыня такая, што звінела ў вушах.

Хтосьці прайшоў басанож па падлозе ў суседнім пакоі. Не, здалося. Побач са мною спаў, пасапваючы, брат.

Мяне турбавалі, усялялі беспрычынны страх расчыненыя ў пакой дзверы. Хацелася закрычаць, хацелася ўстаць і пабудзіць усіх у доме, але я не мог прымусіць сябе нават варухнуцца.

...Не ведаю, колькі часу прайшло. Для мяне шмат, вельмі шмат. Адкалоўся кавалак тынку ад сцяны і ўпаў, гучна бразнуўшы аб плінтус. Ад яго падзення, мне здалося, пачаўся нейкі рух у паветры. Вось яно! На сцяне пачалі ўспыхваць дробныя фасфарычныя часцінкі, з кожнай хвілінай іх рабілася ўсё больш, яны прымалі відавочную форму.

Хутка на сцяне з'явіўся зялёны твар, які быў сатканы з гэтых часцінак, але вочы ягоныя былі — жывыя, вочы былі — чалавечыя!

Невядома адкуль данесліся сумныя гукі флейты. Успыхвалі новыя часцінкі, твар павялічваўся да памераў сцяны, і не мог адарваць позірку ад густых кучароў і барады, ад пукатага лоба, ад вачэй, якія свяціліся перавагай і нянавісцю.

Міжволі я паклаў руку на братаў плячук і сціснуў яго. Брат заварочваўся ў сне.

І твар знік. Толькі зараз я адчуў стук сэрца ў грудзях і зведзеныя сутаргай ногі. І адразу ж праваліўся ў прадонне сну.

...Новае абуджэнне было дзіўным: я добра ўсё чуў, але ніякая сіла не магла прымусіць мяне расплюшчыць вочы. Хтосьці ўвайшоў у пакой і засланіў сабой месячнае святло, што падала з вокнаў. Перапыніў сонны подых і падняў галаву брат.

— Андрэйка, бабуля памерла,— скрозь слёзы сказала наша мама.

— Ну, што ж зробіш?.. Ты не плач так...

Праз імгненне я ўжо моцна спаў і нічога не чуў.

Часам я думаю: можа, і не прачынаўся я тады, і гэты твар на сцяне мне толькі прысніўся?.. А калі прачынаўся?.. Бабуля сапраўды памерла ў тую ноч.






СМЕХ НЕ РАСКОША

## Прыгоды Думчуса

**ПАКОЛЬКІ смех яшчэ нікому не пашкодзіў, прапануем вашай увазе рэшткі з «Калейдаскопу» Андзельмана КАТКУСА.**

ФЕНОМЕН. На якой бы замежнай мове ні размаўляў студэнт Думчус, яго размову разумее любы іншаземец, які ведае літоўскую мову.

СЯБРОЎСТВА. Пахмурны восеньскі дзень. Палова курса «знялася з якара». Выкладчык правярае прысутнічаючых па спісу. На кожнае прозвішча хто-небудзь адгукаецца. Прыйшла і чарга Думчуса. Цішыня. Крыху пачакаўшы, выкладчык пытаецца: «Дык што, у Думчуса тут няма сяброў?»

У АЎТОБУСЕ. Студэнт, на хвіліну адарваўшыся ад канспектаў, просіць: «Заканспектуйце талон...»

## Максим КИД

**Он был человеком, чья слабость и чистая детская любовь играли драму с общим названием Максим КИД. И в этом я не вижу ничего трагического или комического. Он был, каким его сознательно сотворило общее движение вещей.**

**Самому любимому Киту**

*Милая тихо открыла окно,*
*Что заперто было от страха,*
*Закрытое мной от игры давно*
*Окно, превращенное в плаху.*

*Окно или, может быть, выход в Свет,*
*Дождем освежающий струны,*
*Запевшие вдруг среди тихих планет,*
*Нарушив наш танец лунный.,*

*Прорвало... Рассыпалось гроздью удач*
*Мое одиночество в вечность,*
*И только смеется, не зная про плач,*
*Любимого Бога Млечность.*

*Милая, тише, мои корабли*
*Открылись ветрам и шторму.*
*Милая, видишь, там, вдали,*
*Нет слова «поздно» и «норма».*

*Милая, видишь —*
*пошли дожди,*
*Милая —*
*это от плача.*
*А я собираю*
*в руки Любви*
*Падающую*
*с неба*
*удачу.*

* * *

*А река никогда не умрет,*
*Влажность трав, рос, букетов цветенье,*
*Звездопад — Листопад — Ледоход —*
*И босым по рассветам осенним.*

*Из цикла «Небо»*

*Пурга смела Надежду с алтаря*
*И, рассыпаясь искорками звезд,*
*К тебе несется стужа января*
*И запах роз.*

*Соединив невидимые руки,*
*Танцуя вальс*
*изысканнейших мук,*
*надежды семена являют круг*
*И колокольчиковы солнечные звуки.*

* * *

*Странно: чувствую ливни, и лужи, и осень...*
*В мир же лето прокралось соломой шурша,*
*Бесконечные волны и озера просинь*
*Положили на сердце мне шум камыша.*

*Ты зачем сокрушаешься, глупый камыш?*
*Для Начала светлее времен не бывало,*
*Где ты видел дитя, чтоб в войну не играло?*
*А в душе его — радость, в душе его — тишь...*

*Но стрельба бесконечна, не видно окошка,*
*Чтобы воздуху роз разбросать лепестки.*
*От потерь переполнилось солью лукошко,*
*А глаза застеклились от жесткой тоски.*

*Лишь Надежда сквозь воздух прозрачный*
*и зыбкий:*
*«Надо жить, отмеряя паденья улыбкой».*

* * *

*Потерянные вёсны, словно вёрсты*
*Наматывает память на обшлаг,*
*Я что-то делал, видимо не так,*
*Глядят глаза открыткою потертой,*

*Глядят глаза — подавленные скукой*
*Рожественские свечи-огоньки,*
*Венки плывут вдоль берега реки —*
*Забудешься, и гаснут болью скупо.*

*Хоровод кружит как снег,*
*Белый танец, белый век,*
*Белый мальчик, белый пес,*
*Белый смех залил, занес.*

*Разорвал, зажег, забрал,*
*Радость — окрестил штурвал,*
*Я упал, а парус мой —*
*Белым Лебедем Домой.*

Игорь ДАРО

## Я и Диоген

Я гулял по берегу моря. Был жаркий день, делать было совершенно нечего, все друзья разъехались по тетям и прабабушкам, и я гулял один, никого не надеясь встретить на этом пустынном берегу. Вообще, день был странный: солнечно и почти штиль, а у моря никого нет. Но не это меня беспокоило. Мой любимый дворняга Альберт тяжело заболел. У него была ангина, бронхиальная астма и ларинготрахеит одновременно. Посреди лета. Впрочем, я подозревал, что он просто содрал себе глотку, облаивая наглую Киссу, кошку моей соседки Раисы Иосифовны.

И вот я шел по берегу, подфутболивая ногой камешки покрупнее и предаваясь грустным мыслям о безвременно заболевшем Альберте, шел долго, пока не увидел перед собой бочку, лежавшую на боку, на самых подступах языкастых волн. Из бочки торчала удочка, поплавок плавно покачивался на волнах метрах в десяти от берега.

Я обошел бочку и в круглом проеме, обращенном к морю, увидел старика. Он был в одной рубашке. Даже не в рубашке, а в рубище каком-то. Сидел, поджав ноги по-турецки, не двигаясь и завороженно глядя на поплавок. Удочка, казалось, намертво приросла к его рукам, а глаза старика утонули где-то в глубине морщин.

— Здравствуйте,— вежливо сказал я.

Старик кивнул.

— И как улов? — поинтересовался я.

Он не ответил. Для приличия я потоптался на месте и посмотрел немного на поплавок, который все так же плавно качался на набегающих волнах. Вроде бы, пора было и уходить, но меня разбирало любопытство: что это за молчаливый старик и что он делает в бочке?

— А меня зовут Эрик. А вас? — снова спросил я.

— Диоген,— ответил он таким голосом, словно говорил в трубу.

— Только сейчас я заметил, что его седая борода почернела от времени.

— Я вас знаю,— произнес я, усаживаясь рядом на гальку.— Книжку читал.

Старик продолжал удить рыбу.

— А вы долго в бочке сидите?

Он опять кивнул головой.

— Чего ж я раньше вас не видел? — не отступал я.

Старик молчал.

— Сколько же вам лет?..

— А сколько тебе секунд? — ответил Диоген.

— Не знаю,— сказал я.

— И я не знаю,— ответил Диоген.

— Можно посчитать,— сказал я.

— Можно,— согласился Диоген.

Мы посидели еще чуть-чуть, продолжая ловить рыбу, которая почему-то не ловилась.

— А как вы сюда попали? Вы не жили в Древней Греции!— вдруг вспомнил я.

Диоген молча пожал плечами.

— Я знаю,— сказал я.— вы древний философ и мудрец. И в бочку вы забрались, чтобы спрятаться от людей, которые вам мешают.

— От жары,— ответил философ.

— Зато теперь каждый школьник знает больше вас,— не без гордости сказал я.

— Каков же объем куба, чадо мое? — прогудел Диоген.

— А в кубе,— немного подумав, ответил я.

— А квадрата?

Я изо всей силы напряг свою память, но формулы так и не вспомнил. Мне показалось, что Диоген улыбнулся, но улыбка утонула в его бороде.

И вдруг мне стало жалко этого одинокого старичка, который две тыщи лет просидел в своей бочке и даже говорить разучился. Наверное, он и не ел ничего — рыба-то не ловится...

— Может, я могу вам чем-нибудь помочь? — участливо спросил я.

— Можешь. Не мешай рыбу ловить.

И я ушел. А что мне было делать?

На следующий день бочки на месте уже не было. Наверное, унесло в море...

*Малявала Н. ЖУК.*







## СМЫСЛ ЖИЗНИ

— А знаете, коллега, у меня родилась гипотеза. Долгое время наблюдая за этими самыми примитивными существами во Вселенной, я сделал вывод, что они специально существуют для нашего обслуживания...

— Я думаю, не стоит преувеличивать, мой юный друг, хотя в главном вы безусловно правы: их поведение действительно примитивно. Посмотрите, они опять бросают конфеты!..

Обиженные обезьяны перешли в угол клетки и молча уселись, еще раз убедившись в том, что самое главное в жизни — философские размышления.


Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

21 лістапада
Зак. 2079.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.